Упраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Аддзел адукацыі Зэльвенскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Елкаўская сярэдняя школа”



# Развіццё патэнцыялу вучняў на ўроках літаратурнага чытання

**З вопыту работы Л.Б.Дзянішчык**


АНАТАЦЫЯ

Прадстаўлены вопыт работы па прымяненню прыёмаў для развіцця бегласці чытання малодшых школьнікаў на ўроках літаратурнага чытання праз выкарыстанне сістэмы практыкаванняў.



Аўтар-складальнік: **Дзянішчык Людміла Баніславаўна**, настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, кіраўнік МФ Школы перадавога вопыту



Елка
2022

Упраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Аддзел адукацыі Зэльвенскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“ Елкаўская сярэдняя школа”

# Развіццё патэнцыялу вучняў на ўроках літаратурнага чытання

З вопыту работы Л.Б.Дзянішчык

Елка, 2022

Рекамендавана метадычным саветам
ДУА “ Елкаўская сярэдняя школа”

Аўтар-складальнік: **Дзянішчык Людміла Браніславаўна**, настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, кіраўнік МФ Школы перадавога вопыту

Рэцэнзент: Давыдчык Н.Ч., нам. дырэктара па ВР ДУА “Елкаўская сярэдняя школа”

Развіццё патэнцыялу вучняў на ўроках літаратурнага чытання (з вопыту работы). Л.Б.Дзянішчык – Елка, ДУА “Елкаўская сярэдняя школа”, 2022. -30 с.

Праблема чытання дзяцей заўсёды актуальная, таму што чытанне адыгрывае вялікую ролю ў навучанні, выхаванні і развіцці чалавека. Чытанне – гэта тое, чаму вучаць малодшых школьнікаў, і тое, праз што іх выхоўваюць і развіваюць. В.А.Сухамлінскі гаварыў, што можна жыць і быць шчаслівым, калі не авалодаў матэматыкай, але нельга быць шчаслівым, не ўмеючы чытаць [6,с.54].

Як паказваюць даследаванні вучоных, мой асабісты вопыт, малодшы школьнік будзе паспяховым па ўсіх школьных прадметах, калі ён валодае дасканалым навыкам чытання. Згодна У.М.Зайцаву неабходна дабівацца “аптымальнага чытання” [1,с.8]. Аптымальнае чытанне – гэта чытанне са скорасцю гутарковай мовы. Менавіта да такой скорасці прызвычаіўся за многія стагоддзі артыкуляцыйны апарат чалавека. Бегласць чытання з’яўляецца самым важным фактарам, які ўплывае на паспяховасць, ад скорасці чытання залежыць працэс развіцця: удасканальваецца аператыўная памяць, устойлівасць увагі, павышаецца разумовая працаздольнасць [1, с.12].

Дасканалая тэхніка чытання прыводзіць да хуткага і правільнага разумення сэнсу прачытанага. Пакуль дзіця не навучыцца чытаць хутка і свядома, думаць і суперажываць у час чытання, гэты працэс будзе дастаўляць яму мала радасці і задавальнення. Эксперыменты паказалі, што хуткае чытанне актывізуе працэсы мыслення і з’яўляецца адным са сродкаў удасканалення вучэбнага працэсу. Удасканальванне бегласці чытання не з’яўляецца самамэтай, паколькі ад яе залежаць іншыя якасці чытання (усвядомленасць, выразнасць).

Пагэтаму трэба імкнуцца, каб у канцы навучання ў пачатковай школе большая частка вучняў мела высокую скорасць чытання.

Шматгадовая практыка работы ў школе, асабістыя назіранні, аналіз дынамікі беглага чытання сваіх вучняў, далі магчымасць зрабіць вывад, што не ўсе дзеці чытаюць бегла, а скорасць чытання ў некаторых вучняў з пераходам у старэйшыя класы не павялічваецца, а памяншаецца. Таму для мяне праблема бегласці чытання стала відавочнай. Павольны тэмп чытання выклікае цяжкасці пры разуменні вучнямі тэкстаў (задач, мастацкіх твораў і іншых), а значыць зніжаецца эфектыўнасць вучэбнай дзейнасці ў цэлым.

Пагэтаму праблему развіцця бегласці чытання я лічу актуальнай.

Я задумалася над пытаннем, як дапамагчы дзецям авалодаць тэхнікай чытання? З дапамогай якіх сродкаў і метадаў вызваць у дзяцей цікавасць да кнігі і ўстойлівае жаданне чытаць?

Мэтай маёй самаадукацыі з’яўляецца вывучэнне літаратуры пра развіццё бегласці чытання малодшых школьнікаў на ўроках літаратурнага чытання праз выкарыстанне сістэмы практыкаванняў.

Вывучаючы літаратуру па дадзенай праблеме, я ўпэўнілася, што існуе шмат прычын, якія тармозяць скорасць чытання. Асноўныя з іх наступныя:

- Парушэнне артыкуляцыі;
- Няправільнае дыханне;
- Рэгрэсіі;
- Малое поле аператыўнага чытання;
- Прыродны тэмп дзейнасці;
- Адсутнасць антыцыпацый (сэнсавай здагадкі);
- Нізкі ўзровень увагі і малы аб'ём аператыўнай памяці.

Пагэтаму для дасягнення мэты па развіцці бегласці чытання я вырашаю наступныя задачы:

1. Садзейнічаць адпрацоўцы правільнага дыхання, артыкуляцыі, папярэджваць рэгрэсіі.
2. Садзейнічаць пашырэнню аператыўнага поля чытання.
3. Развіваць сэнсавую здагадку, ўвагу і аператыўную памяць.

Я распрацавала сістэму практыкаванняў, якія дапамагаюць ліквідаваць прычыны, што тармозяць скорасць чытання і тым самым палепшыць навык чытання. Хачу адзначыць, што ўсе практыкаванні, прыёмы работы, якія я выкарыстоўваю, апісаны ў метадычнай літаратуры. Думаю, што іх выкарыстоўваюць многія настаўнікі пачатковых класаў. Аднак дасягнуць станоўчых вынікаў можна толькі ў працэсе сістэмнай мэтанакіраванай работы.

Выкарыстанне сістэмы практыкаванняў вядзецца мною паслядоўна і паэтапна. Вядома, этапы выдзелены ўмоўна, бо яны цесна звязаны паміж сабой.

Першы этап - падрыхтоўчы. Ён адпавядае першаму класу. Найбольш характэрнымі цяжкасцямі на дадзеным этапе з'яўляецца няправільнае дыханне, парушэнне артыкуляцыі і рэгрэсіі. Таму для гэтага этапа характэрны практыкаванні на адпрацоўку правільнага дыхання, артыкуляцыі і ліквідацыю рэгрэсій.

Другі этап – фарміраванне правільнага беглага чытання (2-3 класы). Практыкаванні гэтага этапа накіраваны на пашырэнне аператыўнага поля чытання, на развіццё сэнсавай здагадкі, на павелічэнне прыроднага тэмпу дзейнасці, на развіццё ўвагі і аператыўнай памяці.

Трэці этап – карэкцыйны (4 клас). На гэтым этапе пераважае індывідуальная або дыферэнцыраваная работа з тымі вучнямі, у якіх выяўлены слаба сфарміраваны навык чытання, вызначаюцца прычыны і праводзіцца карэкцыйная работа.

Пачынаючы з першага класа, для кожнага вучня заводжу папку “Вучымся хутка чытаць”. На працягу навучання ў пачатковай школе яна папаўняецца практыкаваннямі для фарміравання беглага і правільнага чытання.

Пачынаю работу з дыхальнай гімнастыкі і адпрацоўкі чыстага вымаўлення гукаў. Для фарміравання правільнага дыхання і валодання голасам прапаную вучням практыкаванні “Задуй свечку”, “У ліфце”, “Стрымліванне дыхання”, “У магазіне кветак” і іншыя. На ўроках выкарыстоўваю фанетычныя і артыкуляцыйныя практыкаванні. Яны садзейнічаюць правільнаму вымаўленню гукаў, слоў, развіваюць уменне чуць гукі ў словах, падбіраць словы на пэўны гук.

У моўную размінку для 1-2 класаў уключаю артыкуляцыйныя практыкаванні “Пчолкі на лузе”, “Жучкі ў палёце”, “Насос”, “Трактар”, “Цягнік едзе” і іншыя. Дарэчы, гэтыя практыкаванні можна выкарыстоўваць і ў якасці фізкультхвілінак у 1 класе.

Калі для моўнай размінкі выкарыстоўваюцца невялікія вершы, то чытаем іх весела ці сумна, здзіўлена, урачыста. Гэтыя практыкаванні дзеці выконваюць з задавальненнем, а станоўчыя эмоцыі – гэта заўсёды добры вынік.

Такім чынам, моўная размінка дае эмацыянальны настрой, а займае ўсяго 2 - 3 хвіліны. У 3-4 класах акцэнтую ўвагу на інтанацыйную размінку. Прапаную сказы ці невялікія вершы, якія трэба прачытаць з пытальнай, клічнай ці апавядальнай інтанацыяй.

Выкарыстоўваю і такія артыкуляцыйныя практыкаванні:

1. Артыкуляцыя галосных, зычных, спалучэнняў галосных і зычных.

АОУЭІЫ, ОУЭІЫА, УЭІЫАО ( спачатку чытаем па парадку, потым пачынаем з другой галоснай, затым – з трэцяй і г.д.); З-Ш-С, Ш-З-С, С-Ш-З (дзеці самі мяняюць парадак зычных, галоўнае патрабаванне – вымаўляць выразна).

2. Фанетычная або артыкуляцыйная гімнастыка: задаю вучням пытанне, у якім пытаю пра якое-небудзь дзеянне. Дзеці вымаўляюць гук.

- Як вые воўк? (У-у-у!) - Як дрыжаць ад холаду? (В-в-в!)

- Што гавораць хворыя, калі доктар глядзіць горла? (А-а-а!)

3. Дыдактычная гульня “ Хто больш?” Неабходна прыдумаць словы з вывучаным гукам у пачатку, сярэдзіне, канцы слоў.

4. Дыдактычная гульня “Хто самы ўважлівы?” Прапаную вучням знайсці аднолькавы гук у словах: парта, партфель, памідоры, паўлін, канапа, рэпка. Або: адгадай імя дзяўчынкі, выкарыстоўваючы першыя гукі слоў: дом, астра, шар, ананас.

Для адпрацоўкі правільнага вымаўлення гукаў выкарыстоўваю таксама чыстагаворкі і скарагаворкі, работу са структурнымі складовымі табліцамі. Дзеці вельмі любяць дагаворваць чыстагаворкі, у 3-4 класах – прыдумваюць свае ( Дадатак 1).

Скорасць чытання залежыць і ад колькасці рэгрэсій, гэта значыць зваротных рухаў вачэй з мэтай паўторнага чытання ўжо прачытанага. Асабліва гэта можна заўважаць ў 1 класе. Для дасягнення станоўчых вынікаў выкарыстоўваю трэніровачныя практыкаванні. У першым класе праводжу практыкаванне “Чытанне з акенцам”. Кожнаму вучню даю ліст паперы памерам 10 см на 5 см. З правага боку выразаю невялікае “акенца”, па вышыні роўнае шырыне радка, а па даўжыні яно адпавядае памеру склада прыкладна з 3-4 літар. Лісток накладваецца на радок і перамяшчаецца па ім. Спачатку вучу дзяцей, як гэта рабіць, потым вучні самі карыстаюцца такім “акенцам”. Пры перамяшчэнні акенца па радку погляд вучня плаўна рухаецца разам з лістком, а паўторнага прачытвання не назіраецца, так як прачытанае закрываецца. Лічу, што ліквідацыі рэгрэсій садзейнічаюць таксама наступныя практыкаванні, якія часта выкарыстоўваю:

1. Чытанне пар ці слупкоў слоў, якія адрозніваюцца адной літарай :

| | | |
|---|---|---|
| ваш | бор | ком |
| вам | бок | кот |
| вас | бот | кол |

2. “Знайдзі лішняе слова”.

Рэчка рэчка грэчка рэчка

Галка палка галка галка

3. Чытанне ланцужкоў роднасных слоў:

Грыб – грыбок – грыбны – грыбнік – грыбасей

4. Чытанне слоў, у якіх мінімальныя адзінкі чытання надрукаваны шрыфтам featuresрознага памеру: РОГ, піРОГ, паРОГ, РОГат, даРОГа, насаРОГ; буКВАр, КВАтэра, КВАч, КВАс, сКВАрка, морКВа.

Вялікі недахоп чытання ў малодшых школьнікаў – малое поле аператыўнага чытання. Таму выкарыстоўваю практыкаванні, якія дапамагаюць пашырыць поле зроку так, каб вочы бачылі не толькі 1-3 літары, а адразу цэлае слова ці некалькі слоў.

Для пашырэння аператыўнага поля чытання выкарыстоўваю практыкаванне “Трэніруем вочкі”, “Складовая піраміда” , “Слоўныя піраміды”, “Зоркія вочкі”, “Фатограф” і іншыя.

Гледзячы ў цэнтр на кропку і не рухаючы вачамі па гарызанталі, трэба пастарацца ўбачыць два склады аднаго слова. Выкарыстоўваю таксама табліцы Шультэ, якія значна пашыраюць поле зроку. Пры рабоце з табліцамі

погляд абавязкова фіксуецца на зялёнай кропцы ў цэнтры табліцы. Стаўлю перад вучнямі задачу бачыць табліцу цалкам. Называю літару, а вучні павінны знайсці яе, не адводзячы вачэй ад цэнтра. Добры вынік у развіцці аператыўнага поля чытання даюць зрокавыя дыктоўкі, якія пачынаю выкарыстоўваць з другога класа. Яны ўключаюць 18 набораў, у якіх павелічэнне даўжыні сказаў адбываецца паступова, па адной-дзве літары. Неабходная ўмова: вучні павінны запомніць словы і сказы, пры гэтым звяртаецца ўвага на арфаграфічнае напісанне слоў ( Дадатак 2).

Таксама я праводжу работу па павелічэнні прыроднага тэмпу дзейнасці. Прыродны тэмп дзейнасці – гэта хуткасць, з якой працуюць псіхічныя працэсы: памяць, увага, мысленне, успрыняцце, уяўленне. І хаця прыродны тэмп дзейнасці гэта прыроджаная ўстойлівая ўласцівасць нервовай сістэмы, на працягу жыцця яна можа змяняцца. Гэта значыць, што выкарыстоўваючы пэўныя практыкаванні, можна павялічыць тэмп чытання. Для гэтай мэты выкарыстоўваю наступныя віды чытання: “ Маланка”, “Буксір”, “Спрынт”, “Фініш”, “Разведка” ( Дадатак 3).

У сваёй практыцы шырока выкарыстоўваю шматразовае чытанне. Прапаную дзецям незнаёмы тэкст з наступнай паслядоўнасцю заданняў:

- Чытаць тэкст адну хвіліну, па маёй камандзе спыніцца. Адзначыць месца, да якога дачыталі або палічыць прачытаныя словы.
- Чытаць тэкст яшчэ адну хвіліну. Адзначыць слова, да якога дачыталі другі раз. Параўнаць вынік з папярэднім. Безумоўна, што другі раз вучань прачытае на некалькі слоў больш. Павелічэнне тэмпу чытання вызывае ў вучняў станоўчыя эмоцыі, ім хочацца чытаць яшчэ раз. Увогуле, шматразовасць чытання мае для развіцця бегласці чытання асаблівае значэнне. Але яно будзе цікавым і ненадакучлівым для вучня, калі перад ім кожны раз ставіцца новая задача, калі паўторны зварот да тэксту выклікаецца пошукам новага адказу. Я выкарыстоўваю шмат прыёмаў для паўторнага чытання:

- Прачытай словы, якія пачынаюцца з літары … (са склада…).
- Прачытай словы, якія надрукаваны з вялікай літары.
- Знайдзі і прачытай самае кароткае слова (самае доўгае) у сказе.
- Прачытай словы-імёны ( назвы жывёл, дрэў, агародніны, мэблі і інш).
- Прачытай першае (апошняе) слова ў сказе.
- Прачытай словы, сказы, якія адносяцца да малюнка на старонцы.
- Знайдзі і прачытай адказ на пытанне… .
- Знайдзі і прачытай словы пэўнага героя.
- Знайдзі і прачытай урывак, які трэба прачытаць радасна (сумна).

Прынцып шматразовага чытання дазваляе вучням кожны раз знаходзіць у тэксце нешта новае, цікавае, тое, чаго раней не заўважалі, нараджае ў дзяцей новые думкі і пачуцці, якія садзейнічаюць з'яўленню нечаканых асацыяцый, жаданню падзяліцца сваімі разважаннямі з сябрамі і зрабіць новыя назіранні, зноў углыбіцца ў змест прачытанага твора, яшчэ раз перачытаць асобныя ўрыўкі, апісанні. Усё гэта садзейнічае стварэнню станоўчага эмацыянальнага фону, стымулюе пазнавальную і мысліцельную актыўнасць.

Вялікую ўвагу надаю выпрацоўцы прыёму сэнсавай здагадкі (антыцыпацыі).

Калі ў дзяцей не сфарміраваны навык антыцыпацыі, то для разумення сэнсу радка, ці асэнсавання зместу прачытанага ім неабходна дачытваць кожнае слова ў сказе да канца, што значна зніжае скорасць чытання.

Выкарыстоўваю практыкаванні, якія садзейнічаюць развіццю сэнсавай здагадкі:

- Чытанне з прапушчанымі літарамі ці канчаткамі ( лоўк… рук…);
- Прадоўжы радок ( Жывуць-пажываюць, гора …(не знаюць) ;
- Займальныя мадэлі (с_нц_, р_д_сць, ч_р_ўн_ц_);
- Чытанне тэкста праз слова;
- Чытанне наадварот;
- Чытанне з дапамогай рашоткі;
- Прачытаць у сказах толькі дзеясловы, назоўнікі (іншыя часціны мовы).
- Чытанне словазлучэнняў з прапушчанымі маленькімі словамі (прыназоўнікамі) (хлопчык _ добрым сэрцам);
- Выкарыстанне прыказак і прымавак, якія трэба дапоўніць патрэбнымі словамі (Лепш позна, чым … . Сем разоў адмерай, …).

Напрыклад, пры вывучэнні казкі Г.Васілеўскай "Усмешка" ("Літаратурнае чытанне", III клас) прапаную вучням перад чытаннем заданне: Прачытайце выразы. Дадайце літары, якіх не хапае. ( Выразы запісаны на дошцы):

| | |
|---|---|
| злы ч_р_ўн_к | ч_рн_я спр_вы |
| цёпл_я хв_лі | зял_ным ліст_чк_м |
| к_з_ч_ны г_р_д | гладк_мі кам_ньч_камі |
| бл_кітныя д_хі | каля бл_к_тнага фант_на |

Пры арганізацыі работы па развіцці сэнсавай здагадкі з вучнямі 1-2 класаў прапушчаныя літары ці словы часта закрываю сняжынкамі, лісточкамі, кляксамі. Гэтым развіваецца і падтрымліваецца цікавасць вучняў да чытання.

Для трэніроўкі ўвагі прапаную вучням чытаць словы ззаду наперад. Дзецям заўсёды хочацца паспаборнічаць – хто хутчэй чытае. Гэтаму дапамагае практыкаванне “Спрынт”, якое таксама выкарыстоўваю для трэніроўкі ўвагі і бегласці чытання. Да дошкі выходзяць некалькі вучняў, прапаную ім знайсці аднолькавы ўрывак у тэксце і па камандзе яны пачынаюць чытаць адначасова ўголас, хто хутчэй, правільна выгаворваючы канчаткі. Пры гэтым дзеці вучацца быць уважлівымі і засяроджанымі. Бо побач чытаюць другія вучні ўголас і перашкаджаюць засяродзіць увагу.

Развіццю ўвагі садзейнічаюць і практыкаванні “Гульня ў хованкі”, “Знайдзі памылку”, “Знайдзі слова”, пад час якіх я пачынаю чытаць у любым месцы тэкста, а дзецям неабходна знайсці дадзенае месца і чытаць разам, або пры чытанні я дапускаю памылкі, а вучні павінны пачуць памылку і прачытаць правільна. Такое чытанне падабаецца дзецям, таму што паднімае іх асабісты аўтарытэт і прыдае ўпэўненасці ў сваіх сілах. Гэтыя практыкаванні спрыяюць пашырэнню аператыўнага поля чытання вучняў, дапамагаюць бачыць цэласныя вобразы слоў, трэніруюць увагу.

Для развіцця скорасці чытання ўдзяляю ўвагу чытанню моўчкі. Праводжу практыкаванні “Вочы”, “Губы”. Часта практыкую чытанне ўпаўголасу. Для гэтага па тэме ўрока выкарыстоўваю дадатковы матэрыял для чытання. Дзецям падабаюцца такія віды чытання, як чытанне за дыктарам, чытанне за лідарам, чытанне па ролях, чытанне ў тэмпе скарагаворкі, чытанне з паскарэннем, выбарачнае, чытанне пад рытмічны стук, чытанне ў парах “рэхам”.

Падводзячы вынікі сваёй работы па тэме самаадукацыі, я магу сцвярджаць, што ў класе ўзрасла якасць чытання: паменшылася колькасць памылак, дзеці больш асэнсавана ўспрымаюць тэксты, упэўнена адказваюць на пытанні.

Вынікі маніторынгу за 2 гады навучання паказалі стабільнасць сфарміраванай бегласці чытання. Лічу, што сфарміраваная бегласць чытання спрыяе паляпшэнню паспяховасці вучняў па іншых прадметах (беларуская мова).

Зыходзячы з вынікаў дыягностыкі і асабістых назіранняў, я з упэўненасцю магу сказаць, што выкарыстанне сістэмы практыкаванняў прывяло да таго, што ў вучняў сфарміраваўся артыкуляцыйны апарат, зменшылася колькасць рэгрэсій, павялічылася поле аператыўнага чытання, сфарміраваўся навык сэнсавай здагадкі, вучні сталі больш уважлівымі і, як вынік, сфарміравалася бегласць і правільнасць чытання.

Удасканаленне тэхнікі чытання станоўча ўплывае на свядомасць і выразнасць чытання, а гэта, у сваю чаргу, дазваляе вучням атрымліваць задавальненне ад чытання.

Сваім педагагічным вопытам па тэме “ Развіццё бегласці чытання ў малодшых школьнікаў на ўроках літаратурнага чытання праз выкарыстанне сістэмы практыкаванняў “ неаднаразова дзялілася з калегамі. У бягучым навучальным годзе давала адкрыты ўрок для настаўнікаў пачатковых класаў па тэме “Развіццё патэнцыялу вучняў на ўроках літаратурнага чытання”. Практычная значнасць дадзенай тэмы самаадукацыі заключаецца ў тым, што віды заданняў і практыкаванні, якія я апісвала, могуць быць выкарыстаны педагогамі першай ступені навучання агульнаадукацыйнай школы на ўроках літаратурнага чытання. Таксама лічу, што дадзеныя практыкаванні, многія з якіх праводзяцца ў форме гульні, робяць працэс навучання цікавым, ствараюць у дзяцей працоўны настрой, спрыяюць пераадольванню цяжкасцей у засваенні матэрыялу, павышаюць пазнавальную актыўнасць. Да практыкаванняў рыхтую нагляднасць, г.зн. выкарыстоўваецца тэхналогія візуалізацыі вучэбнага матэрыялу.

Літаратура:


1. Зайцев, В.Н. Резервы обучения чтению / В.Н.Зайцев.- М.: Просвещение, 1991. – 32с.
2. Неборская, Т.А. Как формировать у младших школьников навык смысловой догадки / Т.А.Неборская // Пачатковая школа. – 2009. - №5.
3. Неборская, Т.А. Учим читать вслух и молча / Т.А.Неборская.- Мозырь: Белый Ветер, 2005.- 220с.
4. Неборская, Т.А. Учим читать, или 350 заданий для чтения учащихся начальной школы / Т.А.Неборская.- Мозырь: Белый Ветер, 2011.- 108с.
5. Оморокова, М.И. Совершенствование чтения младших школьников: методическое пособие для учителя. 2-е издание, исправленное и дополненное / М.И.Оморокова. – М.: АРКТИ, 2001.- 160с.
6. Самкова, И.М. Формирование навыков беглого чтения / И.М.Самкова // Пачатковая школа. – 2008.- №3.
7. Светловская, Н.Н. Обучение детей чтению: Практическая методика: Учеб. пособие / Н.Н.Светловская, Т.С. Пиче-оол. – М.: Академия, 2001.- 282с.

Дадатак 1

## Дыхальныя практыкаванні

**“Дзьмухавец”.** Красаваліся на палянцы жоўценькія кветачкі і гаварылі ўсім, што яны сонейкавы дзеткі. Але праз некалькі дзён замест маленькіх сонейкаў на іх з’явіліся белыя пухнацікі. Асцярожна падуў на іх ветрык, закалыхаў пухнацікі. (Дзеці плаўна і па магчымасці доўга выдыхаюць паветра). А потым ўспомніў, як яны выхваляліся і падзьмуў з усіх сіл. (Моцны доўгі выдых). Разляцеліся пухнацікі па лузе. Але не сціхаў вецер, насіў і насіў іх па лузе. (Дзеці ходзяць па класе і дзьмуць).

**“Званочкі”.** Прыгожыя сінія кветкі хацелі б выканаць вясёлую мелодыю, але могуць зрабіць гэта толькі з дапамогай ветрыку, а ён дзесьці загуляўся. Давайце дапаможам званочкам. Кветак на сцяблінцы шмат і трэба на кожную падзьмуць, каб яна зазвінела. (Дзеці робяць кароткія адрывістыя выдыхі).

**“Пушынка”** . Уявіць, што на далоні ляжыць пушынка. Падуць на яе, каб пушынка павольна і плаўна паляцела.

**“Свечка”.** Скласці далоні разам – гэта свечка. Глыбока ўдыхнуць, рэзка выдыхнуць і задуць свечку.

## Скарагаворкі

1. Мама Мілу мылам мыла.
2. Лена села ля Ліны, Ліда села ля Лады.
3. Наша Нюша несла ношу.
4. Шура шыла шорты Сашу. Шура шыла, Лора парола.
5. Далі Даню дома дыню.
6. Спрытна кроп палоў Пракоп.
7. Села Ліна каля Лены, каля Сашы – Наташа.
8. З бабранятамі бабры робяць грэблю ў бары,
   Рады ўвесь бабрыны род: будзе грэбля цераз брод.
9. Белы бусел баіў байку беламу зайку.
10. У двары горка, пад горкай норка .
11. У чаплі – чапляня, у зайкі – зайчаня.
12. Жвавы вожык жыва жуку пашыў кажух.
13. На двары стары баран грукаў зранку ў барабан.
14. Добра ўсюды добраму. Добраму ўсюды добра.
15. Твая маці і мая маці пяклі булкі ў адной хаце.
16. Пракоп і Барыска елі барбарыскі.

## Чыстагаворкі

1. Ры-ры- ры – у рацэ жывуць бабры.
2. Ша-ша-ша – мама мыла малыша.
3. Су-су-су – на лузе я казу пасу.

4. Ра-ра-ра – над сасной нара.
Ро-ро-ро – ў Мінску ёсць метро.
Ру-ру-ру – заяц грыз кару,
Ры-ры-ры – гудзелі камары.
5. Ча-ча-ча –злавілі ляшча.
Чо-чо-чо – вазьмі мяне на плячо.
Чу- чу-чу- я да месяца лячу.
6. Са-са-са – выпала раса,
Су-су-су – я букет нясу,
Сы-сы-сы – не баюся асы,
Сі-сі-сі – у рацэ карасі.
7 . Ас-ас-ас – пойдзем усе да нас,
Ос-ос-ос – я ўжо падрос,
Усь-усь-усь – братам ганарусь,
ысь-ысь-ысь – у засадзе рысь.
8. Мо-мо-мо – з’елі многа эскімо.
Ма-ма-ма – скора зіма.
Мы-мы-мы – дачакаліся зімы.
9. Жо-жо-жо – мы школьнікі ўжо. Жа-жа-жа – убачылі стрыжа.

Дадатак 2

**Практыкаванні для развіцця ўвагі і аператыўнай памяці**
**(зрокавыя дыктанты)**

| | Колькасць літар | Час |
|---|---|---|
| Набор № 1 | | |
| Ідзе снег | 8 | 4с |
| Бор зялёны | 9 | 4с |
| Наша вуліца | 10 | 5с |
| Родныя браты | 11 | 5с |
| Знайшлі грыбы | 11 | 5с |
| Спевы птушак | 11 | 5с |
| Набор №2 | | |
| Коля захварэў | 12 | 6с |
| Я збіраю суніцы | 13 | 6с |
| У лесе рос ясень | 13 | 6с |
| Наступіла вясна | 14 | 7с |
| Дні стаялі цёплыя | 15 | 7с |
| У лесе многа бяроз | 15 | 8с |
| Набор №3 | | |
| Прыляцелі птушкі | 15 | 8с |
| Ярка свеціць сонца | 16 | 8с |
| Каля вёскі рос клён | 16 | 8с |
| Ліда выцерла дошку | 16 | 8с |
| У зайца доўгія вушы | 16 | 8с |
| Вучні рашалі задачу | 17 | 8с |

**Практыкаванні для развіцця ўвагі да слова і яго частак**

**“Выберы літару”.** Колькі слоў можна напісаць , паставіўшы розныя літары замест пытальнікаў?

?оўк, ла?, ?аза, ?ок, ?ом, к?т, л?г, ?орт, ма?, ?айка, ?ук, ?арта, ?ак, ?алка, ?ара.

**“Склады наадварот”.** Можна праводзіць як гульню. Я кідаю вучню мяч, называю слова. Вучань павінен вярнуць мяч і назваць слова, памяняўшы склады месцамі ( рама – мара, вужы – жыву, ліжа- жалі, лаза – зала, ліса – салі, ліпа –палі). Называю і такія словы, з якіх новыя не ўтвараюцца (вада, кава).

**“Дадай склад”.** На дошцы ці картках напісаны склады. Вучні павінны дадаць склад, каб атрымалася слова ( па-ра, мо-ва, ра-ка, шко-ла). Умова: слова павінна быць двухскладовае.

**“Ператварэнні”.** Гавару вучням, што ў казках яны часта сустракаюцца з ператварэннямі. У словах таксама адбываюцца ператварэнні: змяняецца адна літара і атрымліваецца зусім другое слова. Паспрабуйце і вы заняцца чараўніцтвам, ператварыце:

марскую буру ў атаку (шторм – штурм);

жаночае імя ў пару года (Зіна –зіма, Лена – лета);

рух чалавека ў прыродную з’яву (паходка – паводка);

**“З мухі ў слана”.** У гэтым практыкаванні ператварэнні адбываюцца паступова. Трэба ператварыць:

ката ў мыш ( кот- кош – кыш –мыш);

ваўка ў коз ( воўк – воск – восы – косы –козы);

раку ў мора ( рака –рама – мама - мара - мора);

рэчку ў рыбку  ( рэчка – ручка – рубка – рыбка);

рыбку ў банку ( рыбка – рабка – бабка – банка);

лісу ў гусь ( ліса – ліра – гіра – гора -  мора – морс – торс – торт – борт – бурт – гурт – густ – гусь).

Дадатак 3

**Практыкаванні для павелічэння прыроднага тэмпу дзейнасці**

“ Маланка”.Сутнасць практыкавання заключаецца  ў чаргаванні чытання ў камфортным тэмпе з чытаннем з максімальнай для кожнага вучня хуткасцю, чытання моўчкі з чытаннем услых. Дзеці чытаюць у звычайным тэмпе, а па маёй камандзе “Маланка” максімальна паскараюць свой тэмп чытання.

“ Буксір”.  Чытаю тэкст услых, змяняючы тэмп чытання ў залежнасці ад зместу тэксту, аднак з улікам тэмпу “сярэдняга вучня”. Дзецям прапаноўваецца чытаць гэты ж тэкст моўчкі або ўпаўголасу, але з адной умовай – паспяваць за настаўнікам. Каб праверыць увагу дзяцей пад час чытання, а таксама захаванне імі   хуткасці чытання, якую задаю я, спыняюся на якім-небудзь слове або два разы паўтараю яго. У такім разе вучні таксама спыняюцца і паказваюць на апошняе слова. Выбарачна правяраю вучняў.

“ Спрынт”. Вучні  чытаюць на максімальнай для іх хуткасці незнаёмы тэкст, шчыльна сціснуўшы губы і зубы. Пасля прачытвання дзеці адказваюць на пастаўленыя мною пытанні. У час чытання прыспешваю вучняў.

“ Фініш”.  Па маёй камандзе “ На старт! Увага! Марш!” вучні пачынаюць адначасова моўчкі чытаць тэкст. Той, хто першым дачытаў да вызначанага слова ці групы слоў, паднімае руку  або ўстае з-за парты, гэта значыць, што ён дайшоў да фінішу. Каб праверыць вучняў, а заадно пераканацца ў тым, што яны сапраўды чыталі, а не шукалі вызначаныя словы, задаю некалькі пытанняў на разуменне прачытанага. Практыкаванне можна праводзіць у

больш складаным варыянце – прачытаць тэкст да адказу на пытанне, якое пастаўлена загадзя.

“ Разведка”. Вучні на максімальнай для іх хуткасці праглядваюць тэкст і знаходзяць адказы на пастаўленыя пытанні. Практыкаванне садзейнічае не толькі хуткасці чытання, але і ўменню арыентавацца ў тэксце, знаходзіць галоўнае.

Дадатак 4

**План –канспект урока навучання грамаце (чытанне) ў 1 класе**

Тэма: Чытанне слоў знаёмай структуры.

Мэты: садзейнічаць фарміраванню навыку правільнага і беглага чытання;

стварыць умовы для развіцця вуснага маўлення, садзейнічаць развіццю ў вучняў умення ажыццяўляць самаацэнку;

стварыць умовы для выхавання беражлівых адносін да прыроды.

Ход урока.

1. *Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.*

Празвінеў ужо званок,
Пачынаецца ўрок.
Будзем слухаць і чытаць,
Будзем веды набываць.

- Пакажыце, які настрой у вас на пачатку ўрока. (Дзеці колерам паказваюць свой настрой). Я жадаю вам на ўроку добрага настрою, лёгкіх заданняў і дружнай працы.

2. *Дыхальная гімнастыка.* -Уявіце, што у вас на руках ляжаць сняжынкі. Удыхніце паветра і здуйце сняжынкі з рук.

*Практыкаванне "Вецер" .*

- А зараз паслухайце, як гудзе лёгкі ветрык (В-в-в). Зрабіце ўдых і пакажыце, як дуе моцны вецер (В-в-в).

- На вуліцы зіма. Але некаторыя з вас ужо з нецярпеннем чакаюць лета. Сёння я прапаную вам адправіцца ў падарожжа ў летні лес.

*Практыкаванне "Слоўныя пірамiды".*

- Каб папасці ў лес, мы павінны пераадолець узгорыстую дарогу. Давайце прачытаем словы, якія атрымаюцца. Выразна вымаўляйце кожнае слова.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а | 1 | са | а | 1 | рэ | рэ | 1 | па |
| ра | 2 | са | а | 2 | рэх | рэп | 2 | ка |
| ка | 3 | са | рэ | 3 | ха | тра | 3 | ва |
| ра | 4 | ка | рэч | 4 | ка | дрэ | 4 | ва |
| на | 5 | ра | грэч | 5 | ка | дро | 5 | вы |

- Вось мы апынуліся каля лесу і пачулі, як шумяць дрэвы:

Шумяць дрэвы: шум - шум- шум. Жыць асобна – сум-сум-сум. ( 3 разы паўтараем скарагаворку, павялічваючы хуткасць вымаўлення).

3. *Матывацыйна-мэтавы этап.*

- Адгадайце, хто нас сустракае на лясной палянцы?

Днём яна спіць, а ноччу лятае,

Мышэй, грызуноў, сабе здабывае.

З вялікімі вачамі яе галава,

А як завуць яе, дзеці? (САВА)

- На лясной палянцы нас сустракае Мудрая Сава, якая падрыхтавала для нас заданні. Мы будзем чытаць, каб …(развіваць хуткасць чытання, пазнаваць новае).

Будзем адказваць на пытанні, каб… (вучыцца думаць, разважаць).

- А зараз Сава прапануе нам адгадаць загадку:

Хто пад елкай ці ў лазе
Носіць шапку на назе? ( ГРЫБ).

- А якія грыбы вы ведаеце?

- Паслухайце ўважліва верш, старайцеся пачуць і запомніць назвы грыбоў. (Добра падрыхтаваны вучань чытае верш).

Дождж прайшоў - і ёсць надзея, што грыбоў ён шмат насеяў.
Ля зялёнага дубка я знайшоў баравіка.
А далей іду – ля сцежкі маладыя сыраежкі.
Пад ялінкай невялічкай прытаіліся лісічкі.
Разам з імі ярка-рыжы ажно вочы слепіць рыжык.
Ох, як тут грыбоў багата, Да мяне спяшайся, тата!

- Якіх грыбоў насеяў дождж? Як называецца такі дождж?
( Грыбны, грыбасей).

4. *Аперацыйна-пазнаваўчы этап:*

Мудрая Сава прапануе вам прачытаць словы, якія складаюць "грыбную сямейку": ГРЫБ ГРЫБок ГРЫБны ГРЫБнік ГРЫБасей

- А зараз Сава хоча праверыць, ці ўмееце вы дзяліць словы на склады. Размясціць словы – назвы грыбоў у два кошыкі: у адзін кошык – словы, якія складаюцца з двух складоў, а ў другі – словы з трох складоў. ( На дошцы змешчаны малюнкі грыбоў з назвамі).

| | | |
|---|---|---|
| Рыжык | баравік | |
| Смаржок | лісічкі | |
| Страчок | маслякі | сыраежкі, мухаморы |

- Ацаніце сваю работу з дапамогай колеравых палосак.

Звяртаю ўвагу дзяцей на смаржкі і страчкі. Гавару, што гэтыя грыбы з'яўляюцца ранняй вясной, іх называюць падснежнікамі. А ці можна знайсці грыбы зімой? Сапраўдныя бывалыя грыбнікі і ў сцюдзёныя зімовыя дні наведваюцца ў лес. Ідуць яны па маўклівым зімовым лесе і радуюцца прыкметам. (Вялікія снегавыя шапкі на дрэвах – да багатага ўраджаю грыбоў. Лапы ялін згінаюцца ад снегу – восень будзе грыбная.) ( Прыкметы змешчаны на дошцы, чытаем разам з вучнямі).

*Праводзіцца фізкультхвілінка.* Зараз Мудрая Сава прапануе вам адпачыць разам з ляснымі жыхарамі.

- Наступнае заданне ад Савы- прачытаць тэкст на старонцы буквара.

*Работа з падручнікам.*

Вучні адкрываюць буквары на стар.77, чытаюць назву тэкста, разглядаюць малюнак.

- Што такое рэха?

- На вашу думку, пра што пойдзе гаворка ў тэксце? Даведаемся, ці спраўдзяцца вашы прагнозы.

Чытанне і аналіз тэксту.

- Куды пайшлі дзеці? (У грыбы). Назавіце імёны дзяцей.

- Прачытайце сказ, які пачынаецца з літары У.

- Прачытайце сказы, якія пачынаюцца са слова Тут. Што такое бор? ( гэта сасновы лес).

- Прачытайце сказ пра Рому. Што адказала яму рэха? Прачытайце сказ, у якім ёсць слова КАЛІНА.

- Прачытайце апошні сказ.

- Як трэба чытаць гэты сказ. ( у канцы стаіць !)

*Чытанне "Буксір".* ( У гэты час вучні, якія чытаюць, атрымлівае другі тэкст, які яны павінна прачытаць і адказаць на пытанні).

*Чытанне ланцужком.*

- А зараз Сава хоча з вамі пагуляць. Яна зашыфравала словы з тэксту, а вы павінны здагадацца, якія словы зашыфравала Сава.

*Займальныя мадэлі.* Знайсці ў тэксце словы, якія адпавядаюць дадзеным мадэлям: _ _ы_ы, і_ л_, р_х_, б_р_в_к_, к_л_н_.

*Праводзіцца фізкультхвілінка для вачэй і гульня "Так ці не".*

- У лесе нельга моцна крычаць, каб лес не затаіўся, не спалохаўся, а падзяліўся з намі сваімі тайнамі.
- Можна разбураць птушыныя гнёзды і муравейнікі, праганяць вужоў ці гадзюк.
- Нельга збіваць нагамі мухаморы, бо імі лечацца ласі.
- Нельга пакідаць пасля сябе смецце.
- Убачыўшы паляну з прыгожых кветак, трэба любавацца імі, а не зрываць. Няхай і другія палюбуюцца і парадуюцца.
- Трэба быць сябрамі прыроды.

Калі "так", то вучні хлопаюць, "не" – топаюць нагамі.

- У лесе вельмі многа таямніц. Мудрая Сава прапануе вам разгадаць некаторыя лясныя тайны.

*“Разведчыкі”* – вучні павінны прачытаць схаваныя словы (назвы дрэў, назвы ягад). Размаляваць іх рознымі колерамі.

| | | |
|---|---|---|
| ЛІ | ПЫ | САС |
| РА | БІ | НА |
| ЖУ | ДУ | БЫ |

| | | | |
|---|---|---|---|
| ВА | ЧАР | НІ | ЦЫ |
| МА | СУ | БА | КА |
| ЛІ | НІ | ДУ | ЛІ |
| НЫ | ЦЫ | ПІ | НА |

*Практыкаванне “Зоркія вочкі”.* Прапаную вучням “сфатаграфаваць” (прачытаць) словы, якія напісаны на палосках паперы. Палоску паказваю на некалькі секунд, потым закрываю яе. Вучні называюць слова.

*Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія.*

- Думаю, што Саве спадабалася ваша работа на ўроку. Якое заданне было для вас лёгкім? Якое было самае цяжкае?

Вучні ацэньваюць сваю работу колеравымі палоскамі.

План-канспект урока літаратурнага чытання ў 2 класе

Тэма: Н. Галіноўская. Бабуліна песня; Я. Радкевіч. Хто самы моцны?

Задачы: узбагачаць слоўнікавы запас вучняў лексікай твораў; фарміраваць чытацкае ўменне з дапамогай выбарачнага чытання знаходзіць у тэксце адказы на пытанні, бачыць створаныя аўтарам вобразныя карціны; выхоўваць павагу і любоў да людзей старэйшага пакалення.

Абсталяванне: фотаздымкі дзядуляў і бабуль.

Ход урока

*1. Арганізацыйны момант урока*

*Празвінеў званок і зноў*
*У клас пазваў маіх сяброў.*
*Будзем добра працаваць,*
*Будзем веды набываць,*
*Будзем думаць и чытаць.*

( Праверка падрыхтаванасці вучняў да ўрока)

*2. Праверка дамашняга задання*

- Выразнае чытанне твора Д. Слаўковіча “Разумны аловак” ці падрабязны пераказ апавядання В. Ткачова “Незвычайны дыктант”.

*   Выбарачнае чытанне
- Чаму Алесь пачаў пісаць дыктанты дома?
-  З кім хлорчык пісаў дыктанты?
* Выбарачны пераказ
- Расказаць, які незвычайны дыктант прадыктаваў бацька сыну?
 Самаацэнка і ацэнка чытання вучняў.

*4. Моўная размінка* .

– Каб падрыхтаваць ваш моўны апарат да чытання, прапаную вам правесці моўную размінку.  Для гэтага трэба прачытаць загадку, якая надрукавана на лісточках паперы.

Загадка

*Лепш за ўсіх  ШКАРПЭТКІ вяжа, ( Слоўнікавая работа, малюнак)*
*Казку добрую раскажа,*
*І са мною пагуляе,*
*Хоць зусім не маладая. ( Бабуля)*

- Прачытайце моўчкі 3 разы.
- Прачытайце шэптам.
- Прачытайце суседу хутка.
- Прачытайце ў парах з адпаведнай інтанацыяй.

*4. Вывучэнне новай тэмы*

4.1. Уступная гутарка.

-  Вы правільна адгадалі загадку пра бабулю. Сярод членаў нашых сем’яў самымі паважанымі і любімымі з’яўляюцца вашы бабулі і дзядулі, якія гадавалі і выхоўвалі сваіх дзяцей – вашых бацькоў, дапамагаюць выхоўваць вас – унукаў. Давайце разгледзім прынесеныя   фотаздымкі дзядуляў і бабуль, заслухаем кароткія паведамленні пра іх: кім працавалі, чым займаюцца на пенсіі, які любімы занятак.

Беларускія паэты і пісьменнікі таксама любілі і шанавалі сваіх продкаў, складалі пра іх вершы і апавяданні. З асобнымі такімі творамі мы сёння пазнаёмімся на ўроку.

4.2. Работа над вершам Н. Галіноўскай “Бабуліна песня”

*Першасны сінтэз*

- ✓ СЛОЎНІКАВАЯ РАБОТА:  *веснім, чуйнае, няўрымслівы* (рубрыка “Слоўнік”, с. 28).
- ✓ Успрыманне на слых верша Н. Галіноўскай “Бабуліна песня”, адказ на ўстановачнае пытанне:

- Ці спадабалася вам бабуля з верша Ніны Галіноўскай?  Чаму?

*Аналіз твора і другасны сінтэз*

- ✓ Самастойнае чытанне верша з мэтай падрыхтоўкі да адказу на пытанне 1 (с. 29).
- ✓ Гутарка па пытаннях 2—3 (с. 29).

- Што жадае бабуля свайму ўнуку? Прачытайце адпаведныя радкі верша. Як гэта характарызуе бабулю?

- Чаму трэба памятаць бабуліну песню і родны парог?

Фізкультхвілінка

*Мы стараліся, мы вучыліся.*
*Трошкі, трошкі прытаміліся.*
*Каля парт мы дружна станем*
*Спіначкі свае пацягнем.*
*Памахаем мы рукамі*
*І патопаем нагамі.*
*Рукі ўверх, і рукі ўніз.*
*А каб ногі не балелі,*
*Раз – прыселі, два – прыселі.*
*Зноў чытаць мы захацелі*
*І за парты ціха селі.*

4.3. Работа над апавяданнем Я. Радкевіча “Хто самы моцны?”

*Загадка*

*Усё жыццё ён працаваў,*
*І людзей ён паважаў.*
*Побач з ім была бабуля.*
*Хто ён? Родны мой ... ( дзядуля)*

- Здагадаліся аб кім пойдзе размова ў наступным апавяданні?

*Першасны сінтэз*

- ✓ Слоўнікавая работа з незразумелымі словамі (рубрыка “Слоўнік”, с. 30).
- ✓ Успрыманне на слых апавядання Я. Радкевіча “Хто самы моцны?”. Адказ на пытанне, зададзенае ў загалоўку.

*Аналіз твора і другасны сінтэз*

- ✓ Самастойнае чытанне твора з мэтай пошуку адказу на пытанне 1 (с. 32).
- ✓ Гутарка па пытаннях 2—7 (с. 32).
  - Чым выхваляўся ўнук перад дзедам?
  - Ці ўдалося Стасіку пераканаць дзядулю ў сваёй сіле?
  - Каго з герояў апавядання можна назваць вопытным, назіральным і надзеленым мудрасцю?
  - Чаму аўтар апавядання называе свайго героя не Стас, а Стасік?

- Як дзядуля адносіцца да свайго неўгамоннага ўнука? (з любоўю, цярпліва, з мудрасцю). Дакажыце.
- Чаму хацеў навучыць нас аўтар, калі пісаў апавяданне?

  Чытанне “Разведчыкі.”

- ✓ Падрыхтоўка да чытання па ролях з апорай на памятку, змешчаную на першым форзацы вучэбнага дапаможніка.
- ✓ Чытанне апавядання па ролях.

*5. Дамашняе заданне*

Падрыхтавацца да чытання апавядання Я. Радкевіча “Хто самы моцны?” па ролях.

*6. Вынік урока*

- З якімі творамі пазнаёміліся?
- Чаму пісьменнікі ў сваіх творах звяртаюцца да вобразаў бабулі і дзядулі?
- Чаму навучыў сённяшні ўрок? (Паважаць дзядуль і бабуль, шанаваць іх, дапамагаць ім).
- А зараз я прапаную вам скласці сінквейн пра бабулю і дзядулю.

Складанне сінквейна пра дзядуль ( хлопчыкі) і бабуль (дзяўчынкі):

| Бабуля | Дзядуля |
|---|---|
| добрая ласкавая | працавіты мудры |
| працуе любіць песціць | рамантуе будуе дапамагае |
| Наша бабуля вельмі добрая | Наш дзядуля ўсё ўмее |
| Дзякуй! | Навучы! |

Урок литературного чтения во 2 классе

Тема: «Охранять природу – значит охранять Родину» (по Н. Надеждиной), Е. Серова «Добрый великан»

Цель: создать условия для активной познавательной деятельности учащихся при знакомстве со стихотворением Е. Серовой «Добрый великан».

Задачи:

формировать навыки осознанного, выразительного чтения, способствовать умению анализировать стихотворение, читать «между строк»;

развивать творческое воображение, критическое мышление, умение обобщать и систематизировать, обогащать словарный запас; создать условия и ситуации, способствующие воспитанию экологического поведения, гуманного отношения к окружающему миру

Ход урока

1. *Организационный этап*

Прозвенел уже звонок! Начинается урок!

Первым делом гоним лень!

На уроке не зевать, всем работать, отвечать!

В мире много интересного, нам порою неизвестного.

Миру знаний нет предела…

Так скорей, друзья, за дело!

- Сегодня я верю, что у нас все получится, как надо, потому что (читаем вместе)

«Все, что мы делаем, нужно,

Значит, давайте трудиться

Честно, усердно и дружно!» Пускай эти слова и будут девизом нашего урока.

*2. Мотивация к деятельности: создание ситуации успеха*

*Проверка домашнего задания*

Чтение наизусть стихотворения В.Бокова «Какая наша Родина» .

- Давайте прочитаем наизусть стихотворение «Какая наша Родина» следующим образом: Две строчки – солист, третью и четвёртую – хор и т.д.

Самооценка и оценка подготовки домашнего задания.

*Введение в тему урока, целеполагание*

- Для того, чтобы узнать, какая тема сегодняшнего урока, я предлагаю вам закончить слова, записанные на доске: Охраня … приро…- значит охраня… Роди…. Переворачиваю листы с надписями и называем тему «Охранять природу - значит охранять Родину». Цель нашего урока прочитать произведения на данную тему и постараться разобраться, кого можно назвать другом природы.

- Что значит охранять природу?

(Не уничтожать, беречь, помогать сохранить то, что есть).

*На доске появляются слова, поясняющие глагол ОХРАНЯТЬ:*

Беречь

Защишать

Заботиться

Любить

Помогать

- Что может сделать каждый из вас для охраны природы? (беречь окружающую природу: цветы, кусты, деревья; помогать животным и птицам; по-доброму относиться ко всему живому)

*Обобщение ответов детей:* Слова Родина и природа неразделимы для человека. Природа – это часть Родины. Природа нашей Родины прекрасна и

богата. Но богатства её не бесконечны, поэтому люди обязаны беречь природу, помогать ей, постоянно заботиться о ней.

-Чтобы ещё раз убедиться, какая красивая природа нашей Родины, посмотрите несколько слайдов-пейзажей и попробуйте придумать названия к каждой картинке. С лайд-презентация («Лес, точно терем расписной», «Раздолье в лесу», «Голубые глаза Земли»).

*3. Артикуляционная гимнастика. Речевая разминка.*

- Ребята, представьте, что мы оказались на летнем лугу. Здесь много животных. Чтобы красиво читать и говорить, сделаем речевую разминку.

Вот по лугу скачут лошади и цокают копытами: *упражнение «Лошадка» (присосать язык к нёбу, щелкать языком).*

- Летний луг благоухает цветами. А мы наслаждаемся их ароматом. Сделали глубокий вдох – понюхали запах цветов, затем выдохнули.

А еще здесь много птиц: *чтение скороговорки* (с. 122): В роще щебечут стрижи, чечётки, щеглы и чижи *сначала медленно про себя, потом шёпотом, затем в полный голос быстро и ещё раз очень быстро,* С удивлением, с радостью.

Повторение правил выразительного чтения *(задачи урока)*:

*Говорим всегда красиво, смело и неторопливо,*
*Ясно, чётко говорим, потому что не спешим!*
*Паузы мы соблюдаем, звук ударный выделяем,*
*Хорошо мы говорим, потому что не спешим!*

Словарная работа (слова напечатаны на отдельных листах)

- На уроке сегодня нам встретятся слова, значение которых следует уточнить. Читаем слова цепочкой по одному и объясняем значение. На карточках записаны слова и их значение в два столбика. Нужно стрелками соединить слово и его значение.

| | |
|---|---|
| <u>Великан</u> | ветер разрушительной силы |
| <u>Богатство</u> | изобилие, ценности, ресурсы страны , отдельных людей |
| <u>Защитник</u> | злой, злобный, мстительный; лукавый |
| <u>Ураган</u> | человек огромного роста |
| <u>Лихой</u> | тот, кто охраняет, оберегает, ограждает от враждебных действий; |

4.Учебно-познавательная деятельность. Работа над произведениями по теме урока

Знакомство со статьёй Надежды Надеждиной «Охранять природу – значит охранять Родину» .

- *А теперь внимательно послушайте статью Надежды Надеждиной «Охранять природу – значит охранять Родину» и попробуйте ответить на вопрос.*

*Установочный вопрос:*

- Что очень важное поняли люди на всём земном шаре?

Текст читает учитель. Учащиеся следят по учебникам (с. 118-119)

*Вопросы по тексту:*

- Так что же очень важное поняли люди на всём земном шаре?

- Как сказать по-другому «на всём земном шаре»? (на всей земле)

Чтение слов на стр.118 из рубрики «Читайте правильно»

ПОВТОРНОЕ ЧТЕНИЕ СТАТЬИ .

-Для того, чтобы ответить на вопросы по содержанию текста этой статьи, прочитаем ещё раз цепочкой и «БУКСИРОМ»

- Что значит защитник живой жизни на земле? (защитник птиц, насекомых, рыб, зверей, растений)

– Кто является защитником природы? Почему?

- Как вы думаете, для кого Н.Надеждина написала этот текст?

- К кому она обращается со словами: «Ты ещё маленький, но по сравнению с муравьём ты просто великан?»

– Согласны ли вы с утверждением, что являетесь великанами?

- Зачитайте слова, в которых выражена главная мысль текста.

- Что значит быть добрым великаном?

- А теперь прочитаем стихотворение Екатерины Серовой «Добрый великан». ( Показываю портрет автора, несколько слов об авторе) детская поэтесса, написавшая более 40 поэтических книг.

-Попробуйте ответить, понравилось ли вам стихотворение?

ВЫРАЗИТЕЛЬНОЕ ЧТЕНИЕ УЧИТЕЛЕМ СТИХОТВОРЕНИЯ «ДОБРЫЙ ВЕЛИКАН». ПРОВЕРКА ПЕРВИЧНОГО ВОСПРИЯТИЯ:

- Понравилось ли вам стихотворение?

-О ком рассказывается в этом стихотворении? (О великане и жителях Зелёной страны).

-Так кто же этот великан?

ФИЗКУЛЬТМИНУТКА

– Ребята, герой произведения приглашает нас в Зелёную страну, чтобы мы немного отдохнули. *(Дети выполняют движения со словами)*

Вышли уточки на луг: «Кря–кря–кря!» (шагаем)

Пролетел весёлый жук: «Ж–ж–ж!» (машем руками–крыльями)

Гуси шеи выгибают: «Га–га–га!» (круговые вращения шеей)

Клювом перья расправляют (повороты туловища влево–вправо)

Ветер ветки раскачал: «У–у–у!» (качаем поднятыми вверх руками)

Шарик тоже зарычал: «Р–р–р!» (руки на поясе, наклонились, смотрим перед собой)

Зашептал в воде камыш: «Ш–ш–ш!» (поднимаем руки вверх, тянемся за руками)

И опять настала тишь: «Ш–ш–ш!» (садимся)

И, конечно же, на лугу много бабочек. Бабочки похожи на пёстрые цветы.

Упражнения для глаз:

Спал цветок (закрыть глаза, помассировать веки)

и вдруг проснулся (поморгать глазами)

Больше спать не захотел (руки поднять вверх, вдох, посмотреть на руки)

Встрепенулся, потянулся (руки согнуты в стороны, выдох)

Взвился ввысь и улетел (потрясти кистями, посмотреть влево–вправо, не поворачивая головы)

(Закрыть глаза, выполнить 2–3 раза круговые вращения глазными яблоками влево–вправо, представив, что в класс влетела бабочка и стала кружиться под потолком, затем открыть глаза, поморгать и посмотреть в окно − бабочка улетела)

- Подготовка к чтению стихотворения учащимися вслух:

- На стр.119 в рубрике «Читайте правильно» прочитаем хором слова, которые встретятся в данном стихотворении.

Упражнения по предупреждению ошибочного чтения трудных слов:

(слова записаны на доске пирамидой)

- Для того, чтобы прочитать безошибочно стихотворение, давайте прочитаем пирамиду слов, которые встретятся в этом тексте.

| | |
|---|---|
| КВАР-ТИР-КА | ХЛО-ПО-ЧУТ |
| ЖИЛЬ-ЦЫ | ВЕ-ЛИ-КАН |
| ВЫ-СОТ-НЫЙ | РО-МАШ-КИ |
| РАЗ-ЛО-МАТЬ | БУ-КАШ-КИ |
| РАС-ТОП-ТАТЬ | |

*<u>Повторное чтение и подробный анализ стихотворения</u> (ЧИТАЮТ ДЕТИ ПО ЧЕТЫРЕ СТРОЧКИ, ПОСЛЕДНИЙ 2 строки до слов» эта малая страна вся кругом заселена)*

– Кого встретил Великан в Зелёной стране? (*Улитку, жука, муравьёв, букашек*). Как автор называет улитку?

– Где поселились обитатели лужайки? Зачитайте.

*Чтение стихотворения до конца.*

– С кем автор сравнивает Великана? ( С лихим ураганом)

– Почему мальчик не стал вести себя как лихой ураган? (Потому что он добрый великан).

– Нравится ли вам герой стихотворения?

– Давайте составим его портрет. (На доске появляется схема):

*костюм*—ВЕЛИКАН (какой?) —– *образ* (положительный/ отрицательный)

Для характеристики героя используйте слова на доске:

| | |
|---|---|
| ДОБРЫЙ | ЗЛОЙ |
| ДОБРОСЕРДЕЧНЫЙ | ЖЕСТОКИЙ |
| ЛИХОЙ | ВЕЖЛИВЫЙ |
| ДРУЖЕЛЮБНЫЙ | РАВНОДУШНЫЙ |
| СМЕКАЛИСТЫЙ | СКРОМНЫЙ |
| ЧУТКИЙ | СЕБЯЛЮБИВЫЙ |

– Можем ли мы назвать героя стихотворения другом природы? Почему?

Обобщая ответы, акцентирую внимание на том, что добрый человек относится бережно и внимательно ко всему, что его окружает.

Подготовка к выразительному чтению стихотворения

- Чтобы научиться читать стихотворение красиво, нужно старательно подготовиться. Для этого мы разделим произведение на 2 части. Первая часть – до слов «Если я, великан захочу…», вторая часть – до конца. Первый ряд читает первую часть, второй ряд – вторую часть стихотворения. Будьте очень внимательны: обращайте внимание на знаки препинания, не забывайте делать паузы и логические ударения на важных словах. Интонацией передавайте предложения с восклицательным знаком.

Выразительное чтение

Учащиеся читают стихотворение парами (по желанию группы)

1 пара. Прочитайте в быстром темпе с чувством радости

2 пара. Прочитайте, в среднем темпе с чувством восхищения

3 пара. Прочитайте в медленном темпе с чувством задумчивости

*Выразительное чтение учащихся*

– Для чего автор рассказал нам о добром великане? (Он хотел показать, как вести себя в природе, чтобы никому не навредить). А теперь представьте, что вы добрые великаны.

*Творческое задание (по группам)*

*Групповая работа*

Игра «Добрый великан»

Учащиеся получают плакаты «*Правила друзей природы*» (1–я группа) и «*Будь природе другом*» (2–я группа) и карточки с заданиями.

Карточка 1

Внимательно рассмотрите плакат. Составьте «Правила друзей природы». Свой ответ начните словами: «Добрый великан никогда не станет…»

Карточка 2

Внимательно рассмотрите плакат. Составьте «Будь природе другом». Свой ответ начните словами: «Добрый великан всегда…»

По материалам плакатов группы составляют рекомендации, как нельзя себя вести в природе и что можно сделать, чтобы помочь сохранить природные богатства. В результате групповой работы учащиеся повторяют основные правила поведения в природе.

1–я группа начинает свой ответ словами «Добрый великан никогда не станет…»

– разрушать муравейники;

– ловить бабочек;

– жечь костры в лесу;

– шуметь в лесу;

– ловить рыбу сетью;

– рвать ягодные кустики;

– разрушать птичьи гнёзда;

– сорить

2–я группа начинает свой рассказ словами «Добрый великан всегда…»

– подкармливает животных зимой;

– сажает деревья;

– огораживает муравейники;

– собирает макулатуру;

– делает кормушки для птиц и скворечники;

– собирает мусор.

Этап рефлексии. Оценка результатов деятельности

***Игра «Луг доброты»***

– Ребята, мы много времени провели на лугу. А ведь у него есть название. Оно состоит из этих букв: т, о, д, р, б, а, о (на доске таблички с буквами).

Как называется наш луг? (Доброта).

–У вас на партах бабочки и полоски бумаги с разными словами — названиями качеств характера. Выберите одно качество для своей бабочки, чтобы она смогла полететь на луг Доброты. Объясните свой выбор.

*Ученики выбирают бабочек и объясняют свой выбор.*

Облако слов:

- Попробуйте сформулировать с помощью трёх слов, что самое главное вы поняли на уроке. (Родина, земля, беречь. Землю и Родину надо беречь))

***Учитель***. Оцените свою работу на уроке.

-Я благодарю вас за работу. Вы отлично трудились сегодня.

Вы МОЛОДЦЫ!

Д/З. с.120-121 (выр.чит.) научиться выразительно читать стихотворение «Добрый великан»

З вопыту работы

**Развіццё патэнцыялу вучняў на ўроках літаратурнага чытання**

Адказны за выпуск: Л.Б.Дзянішчык
Камп'ютарны набор: Л.Б.Дзянішчык
Вёрстка: Л.Б.Дзянішчык

Надрукавана: 231946, Гродзенская вобласць, Зэльвенскі раён, аг. Елка, вул. Леніна, 42. Тэл 8(01564)32556
E-mail: elkasch@mail.grodno.by